# 1030 ГАДОЎ ПРАВАСЛАЎЯ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ: АД ВЫТОКАЎ ДА СУЧАСНЫХ ВЫКЛІКАЎ

***В.В. Шапялевіч***
*Пінкавічы*

Поўную карціну развіцця праваслаўя на тэрыторыі Беларусі і яе сучаснага становішча нельга ўявіць без кароткага экскурсу ў гісторыю канфесій у спалучэнні з пэўнымі эпізодамі этнічнай гісторыі беларускага народа.

У канфесійнай гісторыі нашай краіны можна вылучыць некалькі перыядаў:

1) X-XV стагоддзі – ад прыняцця хрысціянства да стварэння незалежнай Літоўскай мітраполіі;

2) XVI-XVIII стагоддзі – канфесійная гісторыя зямлі Беларусі і Вялікага Княства Літоўскага ў складзе Рэчы Паспалітай;

3) канфесійная гісторыя Беларусі ў XIX - пачатку XX стагоддзя:

4) паслякастрычніцкая гісторыя рэлігій у Беларусі да 1991 года;

5) сучасная канфесійная структура беларускага грамадства.

У X стагоддзі на беларускіх землях трывала ўкаранілася хрысціянства, яго ўсходняе адгалінаванне, якое прыйшло з Візантыі. Пасля пашырэння хрысціянства ранейшыя паганскія святы і аб рады беларускага народнага календара зліліся з адпаведнымі па часе датамі царкоўнага календара, атрымалі новыя найменні і хрысціянскую дагматыку - у дадатак да зместу. Але праўдзівы змест гэтых трансфармаваных святаў заставаўся паранейшаму паганскім, бо прыстасаванне хрысціянскага календара да народнага адбылося спачатку толькі фармальна. І, ажно да XIX-XX стагоддзяў, беларускі народ па-свойму асэнсоўваў значную частку царкоўных святаў: сведчаннем таму - сляды паганства, якія захаваліся ў хрысціянскай абраднасці і часткова дайшлі да нашых часоў. Таму многія даследнікі лічаць, што менавіта беларуская абраднасць з'яўляецца найбольш спрыяльным грунтам для вывучэння самых архаічных пластоў у славянскіх традыцыях з прычыны ацалелых адбіткаў паганства ў святах і абрадах беларусаў.

Ужо ў X-XI стагоддзях на беларускіх землях існавалі епіскапскія кафедры; сфармаваліся пэўныя элементы праваслаўнага богаслужэння, якія ў агульных рысах дайшлі да нашых часоў - пераняты ад Візантыі каляндар асноўных і двунадзесятых святаў з іх канонамі, літургіяй, царкоўным паданнем і спевамі на царкоў наславянскай і грэцкай мовах. У XI-XIII стагоддзях адбываецца фармаванне новых айчынных святаў, звязаных з ушанаваннем гістарычных асобаў (напрыклад, найпадобнейшай Еўфрасінні, ігуменні Полацкай, і Кірыла, епіскапа Тураўскага), а таксама святаў, прысвечаных падзеям айчыннай і царкоўнай гісторыі. У гэты перыяд складваюцца свае царкоўныя песняспевы замест грэцкіх, каноны і стыхіры на гэтыя падзеі і імёны, што знаходзіць адлюстраванне ў тагачасных богаслужбовых кнігах. Фармуецца і праваслаўны клір з суайчыннікаў, якія ў штодзённым жыцці, у літаратуры, а таксама пад час богаслужэння карысталіся зразумелай для народа мовай.

Прынякце хрысціянства зрабіла станоўчы ўплыў на развіццё нацыянальнай культуры і нацыянальнай самасвядомасці беларускага этнасу. Хрысціянскія ідэі арганічна перапляліся з паганскімі ўяўленнямі аб свеце і Сусвеце і знайшлі ўвасабленне ў беларускіх традыцыях і абрадах.[1]

Праваслаўная царква заставалася галоўнай рэлігіяй у Вялікім Княстве Літоўскім да XVI стагоддзя. Першапачаткова беларуская праваслаўная царква падпарадкавалася Кіеўскай мітраполіі, потым - Маскоўскай. У 1416 годзе пры вялікім князі Літоўскім Вітаўце была створана самастойная Літоўская мітраполія, на чале якой знаходзіўся мітрапаліт Кіеўскі і Літоўскі, у якую ўвайшлі 7 епархій. Яна існавала да XIX стагоддзя.

Лёс праваслаўнай царквы на працягу XVI-XVIII стагоддзяў таксама зазнае пэўныя змены, звязаныя з пераходам большасці насельніцтва ва уніяцтва, а большасці магнатаў і шляхты - у каталіцтва. Праз гэта, паводле тагачасных сведчанняў, у другой па лове XVIII стагоддзя праваслаўная царква ў Беларусі ўяўляла сабой відовішча "надзвычайнага спусташэння". У цэрквах адсутнічаў рытуальны посуд, бракавала службоўнікаў. Пры нешматлікіх, амаль запусцелых і цудам ацалелых храмах заставалася вельмі мала прыхаджан, і набажэнствы адбываліся толькі на храмавыя святы і Вялікдзень.

Тым не менш у гісторыі беларускай праваслаўнай царквы гэты перыяд характарызуецца імкненнем да незалежнасці ад Маскоўскай мітраполіі. У Вялікім Княстве Літоўскім адбываецца пераход на новы грыгарыянскі каляндар (існаваў да XIX ст.). Святары карыстаюцца старымі "Даніканаўскімі" службоўнікамі, распрацоўваюцца чынапаследаванні таінстваў і розных асвячэнняў для пра васлаўных святароў на тэрыторыі ВКЛ. [2]

Менавіта ў XVI-XVII стагоддзях адбываецца фармаванне некаторых спецыфічных рысаў беларускіх праваслаўных святаў: з'яўленне святочных дзён, прысвечаных новым беларускім святым, культу цудатворных ікон Божай Маці існаванне братчын, ушанаванне пятніц.

У гэты перыяд праваслаўная царква на беларускіх землях набыла статус дзяржаўнай і ўвайшла ў склад Рускай праваслаўнай царквы на чале са Свяшчэнным Сінодам. Да Першай сусветнай вайны ў Беларусі існавала пяць праваслаўных епархій, кожная з якіх мела кафедру вікарната епіскапа.

Тым жа часам праводзілася афіцыйная палітыка дэнацыяналізацыі і русіфікацыі, адным са сродкаў якіх служыла і царква. Яна датычыла і "ачышчэння праваслаўнай богаслужбовай практыкі", якая, паводле сведчанняў расійскіх святароў, што служылі ў беларускіх прыходах, мела на сабе выразныя сляды ўплыву каталіцкай і уніяцкай абраднасці. Да 1880-х гадоў "тысячы праваслаўных святароў Заходняга краю Расіі" служылі па старых богаслужбовых кнігах (нярэдка уніяцкага паходжання) з прычыны "неразумення шкоднасці і антыправаслаўнага характару уніяцкіх кніг".[3]

У 1864 годзе пры Міністэрстве унутраных спраў Расійскай ім перыі былі распрацаваны статыстычныя матэрыялы, якія адлюстроўвалі канфесійную структуру Беларусі па губернях. У іх падаюцца наступныя лічбы: у пяці беларускіх губернях (Віленскай, Ві цебскай, Гродзенскай, Магілеўскай і Мінскай) налічвалася каля 9/10 праваслаўных вернікаў і 1/10 рыма-католікаў.

Найбольш падрабязныя звесткі па гэтым пытанні атрыманы пад час Першага усеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі ў 1897 годзе. Згодна з гэтымі дадзенымі, у 40 паветах з большасцю беларускага насельніцтва 66,6% залічвалі сябе да праваслаўнага веравызнання (у тым ліку 62,3% беларусаў), 18,1 % - да каталіцтва (з іх 12,4% - беларусы), 13,5% да іудаизму, 1,8% - да астатніх рэлігій. Найбольш высокая доля праваслаўнага насельніцтва назіралася сярод жыхароў Магілеўскай губерні 83,1% (з іх 80,6% - беларусы); каталіцкага - у Віленскай губер ні - 58,8% (з іх 32,8% - беларусы).

У паслякастрычніцкі перыяд, у 1920-1930-х гадах канфесійная гісторыя Усходняй і Заходняй Беларусі мела адрозненні, абумоўленыя рознымі гістарычнымі лёсамі. Ва ўсходніх губернях Беларусі, у якіх з 1918 года ўсталявалася савецкая ўлада, пачалася жорсткая барацьба з рэлігіямі: зачыняліся цэрквы і манастыры (іх пазней перабудоўвалі ў

сховішчы, клубы, школы ды іншыя установы); падвяргаліся пераследу і рэпрэсіям духавенства (незалежна ад веравызнання), манахі, вернікі. Так, у турмах і лагерах загінулі амаль усе праваслаўныя святары і епіскапы Савецкай Беларусі. І як вынік "барацьбы з рэлігійнымі забабонамі мінулата", у дава енны перыяд амаль усе канфесі страцілі значную частку сваіх малітоўных будынкаў, цэркваў, касцёлаў. [4]

У Заходняй Беларусі, якая да 1939 года знаходзілася ў складзе Польшчы, праваслаўная царква была аўтакефальнай і падпарадкоўвалася мітрапаліту Варшаўскаму Дыянісію. Там жа ажыццяўлялася актыўная дзяржаўная палітыка акаталічвання і апалячвання праваслаўнага насельніцтва. У выніку, не толькі было зачынена мноства праваслаўных храмаў, але і зменшылася (праўда, нязначна) доля праваслаўнага насельніцтва, згодна з дадзенымі перапісу 1921 і 1931 гадоў - з 57,3 да 56,6%.

Пасля аб'яднання Усходняй і Заходняй Беларусі кіраўніцтва СССР было вымушана лічыцца з новымі масамі пабожнага на сельніцтва на далучаных землях і, каб не выклікаць адкрытых канфліктаў, стварыла выгляд рэлігійнай талерацыі, адначасова пры пыніўшы ганенні на канфесіі не толькі ў Беларусі, але і па ўсёй краіне. Цікава тое, што дзейнасць праваслаўнага і каталіцкага духавенства Заходняй Беларусі сталі асновай, як мы убачым далей, для аднаўлення і развіцця духоўнага і царкоўнага жыцця на сельніцтва Беларусі. Адначасова працягваўся працэс фармавання беларускай хрысціянскай традыцыі са сваімі рэгіянальнымі асаб лівасцямі.

У гады Другой сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі, акупаванай немцамі, са згоды нямецкіх акупацыйных уладаў былі адчынены праваслаўныя і каталіцкія храмы, дзейнічалі пратэстанцкія абшчыны - галоўным чынам ва ўсходніх абласцях Беларусі, а заходніх рэлігійныя арганізацыі не спынялі свайго існавання з да ваенных часоў. Нямецкія ўлады разглядалі рэлігію як адзін са сродкаў барацьбы з "бязбожнымі бальшавікамі" і таму спрыялі дзейнасці рэлігійных абшчын.

У аснову дзейнасці праваслаўнай царквы былі пакладзены ідэі нацыянальнага адраджэння: набажэнства на царкоўнаславянскай, пропаведзі, справаводства - на нацыянальнай мовах, зварот да старых традыцый (напрыклад, да старога календара), імкненне да аднаўлення аўтакефаліі Беларускай праваслаўнай царквы.

Аднак фактычна ўсе рэлігійныя арганізацыі знаходзіліся пад жорсткім кантролем акупацыйных уладаў. Так, напрыклад, рэгламентаваліся ўсе даты рэлігійных святаў, нярэдка на загад уладаў іх пераносілі на нядзелю, трыманне пастоў; забараняліся вялікія зборы вернікаў на богаслужбах, асабліва ў будзённыя дні. Пад час вайны трансфармавалася стаўленне савецкай дзяржавы да рэлігійных арганізацый. [5]

Спецыфіка рэлігійнай сітуацыі ў Беларусі.

Спецыфіка рэлігійнай сітуацыі ў Беларусі вызначаецца перш за ўсходняй цывілізацый, з пачарговым дамінаваннем каталіцтва і - на стыку заходняй і праваслаўя. Дзяржавы, якія існавалі ў розныя гістарычныя перыяды на тэрыторыі сучаснай Беларусі, заўсёды вызначаліся поліканфесійнасцю. У цяперашні час у Беларусі ёсць 26 рэлігійных накірункаў, большасць з іх маюць сваю ўласную даўнюю гісторыю.

На беларускіх землях па чарзе дамінавалі праваслаўе, якое на лежыць да ўсходняй і каталіцтва, якое знітавана з заходняй культурнай традыцыяй (выяўлялася супольна з пратэстантызмам). Так, напрыклад, у XVIII стагоддзі, калі землі Беларусі ўваходзілі ў склад Рэчы Паспалітай, да 80% насельніцтва былі католікамі (усходняга і заходняга абраду); зараз, больш чым праз дзвесце гадоў, да 80% вернікаў складаюць праваслаўныя.

Працэсы станаўлення і фармавання канфесійнай структуры беларускага грамадства непарыўна звязаны з гістарычнымі этапамі станаўлення нацыянальнай культуры і самасвядомасці: гэта - выкарыстанне нацыянальнай мовы ў набажэнстве, фармаванне і нацыянальнага кліру, захаванне народных (ад часоў паганства) элементаў у царкоўных святах, абрадах, традыцыях. Царкоўная абраднасць і мова набажэнства на землях Беларусі заўсёды знаходзіліся ў залежнасці ад той канфесіі, якая дамінавала ў грамадстве, прычым на тэрыторыі Беларусі ў рэдкія гістарычныя перыяды яны карысталіся нацыянальнай мовай. Гэта бы по звязана з тым, што праваслаўная і каталіцкая цэрквы, час ад часу

то адна, то другая пераважалі, нярэдка выступалі як сродак ажыццяўлення палітыкі суседніх супраціўных дзяржаў - Рэчы Паспалітай і Масковіі. [6]

Што да абрадаў, святаў і традыцый, то яны займаюць на столькі значнае месца ў жыцці грамадства, што пры выцясненні старой рэлігіі новая звычайна ўбірае ў сябе элементы святаў і ры туалаў папярэдніцы, улучае іх у свой каляндар. Гэты важны фактар спрыяе ўмацаванню сацыяльнай стабільнасці, парадку і раўнавагі у грамадстве, згладжваючы супярэчнасці паміж прыхільнікамі старой і новай рэлігіі. Падобныя працэсы адбываліся ў Беларусі і ў той гістарычны перыяд, калі на змену паганству прыйшло хрысціянства і пазычыла мноства элементаў паганскага культу; і ў часы існавання Вялікага Княства Літоўскага, калі праваслаўе ў XVI - XVIII стагоддзях было выціснута каталіцтвам і уніяцтвам (прычым апошняе практычна цалкам увабрала ў сябе праваслаўную абраднасць); і ў XIX стагоддзі, калі на змену уніі прыйшло праваслаўе, якое ў сваю чаргу шмат што пазычыла ад каталіцкай і уніяцкай абраднасці.

Такім чынам і сфармаваліся рэгіянальныя асаблівасці беларускай царкоўнай абраднасці, якія адрозніваюць яе ад хрысціянскай абраднасці іншых народаў, а таксама адлюстроўваюць асаблівасці нацыянальнай самасвядомасці і культуры. Гэтыя ўзаемапранікненне і ўзаемаўплыў рысаў праваслаўных і каталіцкіх абрадаў найбольш поўна ўвасобіліся ў ідэі уніі.

Акрамя таго, у розныя гістарычныя эпохі складваюцца такія асаблівасці беларускага этнасу, як талерантнасць, павага, захаванне традыцыйных рысаў у культуры, паганскіх і царкоўных хрысціянскіх рысаў - у ментальнасці і абраднасці (хоць некато рыя даследнікі лічаць, што апошні культурны сінтэз даволі складаны і супярэчлівы). [7]

Апошнім часам у Беларусі адбываюцца працэсы, якія завяршаюць фармаванне этнічнай самасвядомасці і звязаны з рэлігійнай ідэнтыфікацыяй. У новых умовах ужо фактычна склаўся Беларускі касцёл, а праваслаўная царква, захоўваючы сваё арганізацыйнае падпарадкаванне Маскоўскай Патрыярхіі, займела новую назву - Беларуская праваслаўная царква. Абедзве цэрквы прызнаюць і ужываюць беларускую мову. У 1999 годзе з нагоды святкавання 10-й гадавіны Таварыства беларускай мовы яе кіраўніцтва звярнулася да гіерархаў праваслаўнай, каталіцкай і пратэстанцкай цэркваў Беларусі з прапано вай прачытаць малітву за беларускую мову, тэкст якой напісала мінская школьніца Марыя заяц. Праваслаўная царква на чале з Філарэтам, мітрапалітам Мінскім і Слуцкім, Патрыяршым экзархам усяе Беларусі, вельмі прыязна паставілася да гэтай прапа новы, а благаславенне мітрапаліта было разаслана па ўсіх епархіях Беларусі. Пробашч касцёла св. Сымона і Алены (г. Мінск) Уладзіслаў Завальнюк, імя якога католікі звязваюць з Беларускім касцёлам, заклікаў усіх хрысціян Беларусі прыйсці ў храмы і прачытаць гэтую малітву.

27 чэрвеня 1999 года ў двух буйнейшых праваслаўных саборах (Свята-Духавым кафедральным і Свята-Пятра-Паўлаўскім) адбыліся маленні за беларускую мову. У той жа дзень падобныя ма ленні прайшлі і ў іншых праваслаўных цэрквах, касцёлах і нават мячэцях. Прычым у СМІ падкрэслівалася важнасць "звароту бела рускага духавенства" да пытанняў нацыянальнай мовы і культуры, бо "агульнавядома, што царква мае велізарны ўплыў на розум нашых суайчыннікаў".

Беларуская праваслаўная царква таксама адчула на сабе ўплыў ідэяў нацыянальнага адраджэння. Так, пад час свята Сабора усіх Беларускіх Святых 20 чэр веня 1999 года ўпершыню адбылася літургія на беларускай мове на тэрыторыі Гродзенскай епархіі. Да гэтага ў праваслаўных храмах г. Гродна набажэнства праходзіла на царкоўнаславянскай мове. Літургія на беларускай мове была звязана з асвячэннем месца будаўніцтва новага храма. У святочную нядзелю, пасля літургіі па беларуску ў старажытнай Каложскай царкве XII стагоддзя, не калькі сотняў вернікаў крыжовым ходам прайшлі ад Каложы у раён горада, дзе плануецца пабудаваць бажніцу ў гонар Сабора Усіх Беларускіх Святых. Як сказаў ігумен Каложскай царквы айцец Аляксандр, "ад сэрца горада, якім усё ж з'яўляецца не Скідальскі базар і не плошча Леніна, а Каложа, ад самага старажытнага

храма крыжовы ход праклаў шлях да храма новага. Літургію на беларускай мове благаславіў епіскап уладыка Арцемій. Пэўна, для гэтага ўжо наспела патрэба".[8]

Такім чынам, зрабіўшы разгляд і аналіз станаўлення Беларускай праваслаўнай царквы, можна прыйсці да выніку, што праваслаўе мае глыбокія гістарыныя карані і звязана з менталітэтам этнасу, таму і  захавалася глыбока у жыцці беларусаў. На афіцыйных рэспубліканскіх мерапрыемствах, такіх, як Дзень Незалежнасці, заўсёды прысутнічаюць лідэры праваслаўнай цэрквы. Закон "Аб святочных днях у Рэспубліцы Беларусь", прыняты 19 снежня 1991 года Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь, прызнаў святочнымі днямі на ўзроўні дзяржаўных святаў вялікія рэлігійныя святы праваслаўнага і каталіцкага календара Вялікдзень, Радаўніцу (Дзень памяці) і Нараджэнне Хрыстова.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Верашчагина А., Гурко А. Гісторыя канфесій у Беларусі. Мінулае і сучаснасць. Мн.,2000

2. Бабосаў Я.М. Сацыядынаміка рэлігійнасці рэлігійнай сітуацыі ўпостсацыялістычнай Беларусі // Весці АН Беларусі. 1995. № 3.

3. Ждановіч І. Першавера продкаў // Роднае слова. 1996. № 8.

4. Зайкоўскі Э.М. Касмалагічныя ўяўленні старажытнага насельніцтва Беларусі // Гістарычна-археалагічны зборнік памяці Міхася Ткачова, Ч.1.Мн., 1993. С. 79-93.

5. Зайкоўскі Э.М. Культы свяшчэнных крыніц і рэк у старажытных жыхароў Беларусі // Тез. докл. Усебеларускай канф. гісторыкаў "Гістарыч- ная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь (новыя кан- опцыі і падыходы)". Мн., 1993. Ч. 1. С. 25-

6. Салавей Л.М. Элементы індаеўрапейскай духоўнай спадчыны ў вобразнай сістэме // Узроўні агульнасці фальклору усходніх славян. Мн., 1993. С. 24-28.

7. Чаквін І., Церашковіч П. Беларусы // Энцыкл. гісторыі Беларусі. Т. Г.

8. Шупа С. З гісторыі новабеларускіх перакладаў Бібліі // Веснік